# Памяти ученого

# Памяці вучонага

# To the memory of scientist

**Віктар Пятровіч**
**КРАСНЕЙ**

**Wiktar Piatrovich**
**KRASNEI**



Здаецца, зусім нядаўна, 20 ліпеня 2016 г., філалагічная грамадскасць краіны адзначала 80-гадовы юбілей прафесара Віктара Пятровіча Краснея, знанага лінгвіста-гісторыка, аднаго з самых аўтарытэтных і руплівых аўтараў шматлікіх падручнікаў па беларускай мове для сярэдніх школ, вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў і выкладчыкаў установаў вышэйшай адукацыі, метадычных і дыдактычных даведнікаў для настаўніцтва Беларусі. Вечарам 26 снежня 2016 г. сэрца навукоўца назаўсёды спынілася…

Амаль 40 гадоў аддаў Віктар Пятровіч роднаму філалагічнаму факультэту БДУ: пасля яго заканчэння, папрацаваўшы колькі часу на радзіме ў Равяціцкай сярэдняй школе Бярозаўскага раёна, у 1966 г. В. П. Красней стаў аспірантам, а пасля паспяховай абароны кандыдацкай дысертацыі «Беларуская філалагічная тэрміналогія пачатку XX ст.» (1969) прайшоў усе службовыя прыступкі педагагічнай кар’еры – ад выкладчыка да прафесара кафедры гісторыі беларускай мовы. З першых дзён працы ў Беларускім дзяржаўным універсітэце малады навуковец імкнуўся пашырыць свой кругагляд, назапасіць фактычны матэрыял для правядзення лекцый і практычных заняткаў, некалькі разоў распісаў на карткі амаль усе творы сучаснай беларускай літаратуры, публікацыі XIX ст., што пазней стала трывалай базай для стварэння вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў-філолагаў: «Практыкум па гісторыі беларускай літаратурнай мовы», выдадзены ў суаўтарстве з Л. М. Шакуном (1978, 1986), «Сучасная беларуская мова» (1984, 1995), «Сучасная беларуская мова. Практычныя заняткі» (1989). Хоць гэтыя працы і ствараліся ў суаўтарстве з больш сталымі і вопытнымі калегамі-выкладчыкамі,

тым не менш рэцэнзенты ў адзін голас адзначалі выразнасць і прадуманасць у падачы матэрыялу, найцікавейшыя прыклады з практыкаванняў менавіта Віктара Пятровіча.

Выкладчыцкі і педагагічны вопыт на філалагічным факультэце БДУ, праца над дапаможнікамі для ўстаноў вышэйшай адукацыі сталі добрым падмуркам і пры стварэнні школьных падручнікаў і вучэбна-метадычных распрацовак для агульнаадукацыйных устаноў. А пачалося ўсё з выдавецтва «Народная асвета», якое ў пачатку 1980-х гг. заснавала серыю кніг «Бібліятэка настаўніка беларускай мовы і літаратуры». Менавіта рэдактар праекта, знаны Іван Курбека, і «падбіў» на гэту справу Віктара Пятровіча. Першая кніга Віктара Краснея «Лексіка і фразеалогія беларускай мовы» (1982) была прыхільна прынята настаўнікамі і вучнямі – даступна, папулярна, даходліва пададзены матэрыял стаў настольным у штодзённай працы беларусаведаў краіны. Трэцяе выданне гэтай кнігі пад назвай «Грані слова» ў 1986 г. атрымала бронзавы медаль на ВДНГ СССР. З гэтага часу і пачалося «двайное жыццё» мовазнаўцы, скіраванае адначасова на карысць студэнта-філолага як будучага настаўніка беларускай мовы і школьніка-пачаткоўца, якому так важна было паказаць хараство роднага слова, пераканаць у яго штодзённай неабходнасці. Дарэчы, многія напрацоўкі і метадычныя знаходкі Віктара Пятровіча спачатку паспяхова апрабоўваліся на ўроках беларускай мовы, якія праводзіла ў мінскіх школах яго жонка, аднакурсніца і аднадумца Святлана Аляксандраўна. Тады ж і склаўся славуты аўтарскі тандэм – Віктар Красней і Яўген Лаўрэль (вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага інстытута адукацыі), плёнам працы якога жывіцца і будзе карыстацца яшчэ не адно пакаленне беларускіх школьнікаў і настаўнікаў. Навукоўцамі-метадыстамі за 25 гадоў сумеснай працы падрыхтавана каля 40 асобных выданняў школьных падручнікаў па беларускай мове для 2–6-х класаў школ з рознымі тэрмінамі навучання. Выйшлі такія метадычныя дапаможнікі, як «Беларуская мова ў 5 класе» (1990, 2002), «Беларуская мова ў табліцах і схемах» (1-е выданне – 1997 г., усяго 10 выданняў), «Беларуская мова ў 6 класе» (1999, 2000), «Здаём экзамен па беларускай мове» (2001, 2003), «Зборнік экзаменацыйных матэрыялаў па беларускай мове для агульнаадукацыйных устаноў (узровень агульнай сярэдняй адукацыі): тэксты для пераказаў» (2009), падрыхтаваны ў суаўтарстве з У. І. Куліковічам, А. А. Радзевічам, З. І. Падліпскай) і інш. У апошнія гады да працы па стварэнні школьных падручнікаў прафесар В. П. Красней падключыў доктара філалагічных навук прафесара А. М. Рудэнка, дацэнтаў У. І. Куліковіча, В. І. Несцяровіча, Г. І. Кулеш, Г. К. Ціванову і іншых навукоўцаў.

У 1990-я гг. Віктар Пятровіч у суаўтарстве з калегамі М. Р. Прыгодзічам, Л. І. Сямешка, Т. Р. Рамзай, супрацоўнікамі тагачаснага Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі прымаў удзел у стварэнні калектыўнай манаграфіі «Беларуская мова», што выйшла ў 1998 г. у г. Аполе (Польшча) у межах міжнароднага славістычнага праекта. Разам з Б. В. Грынбергам і Н. П. Краеўскай выдаў грунтоўны «Русско-белорусский словарь электротехнических терминов» (1993). Дзейсны ўдзел прыняў прафесар В. П. Красней у распрацоўцы Канцэпцыі моўнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, стварэнні праграм па беларускай мове для сярэднеадукацыйнай і пачатковай школы з беларускай мовай навучання.

Шматгадовым полем даследчыцкай дзейнасці Віктара Пятровіча была нацыянальная навуковая тэрміналогія, многія яго працы ў гэтым напрамку сталі амаль хрэстаматыйнымі і сёння шырока цытуюцца ў даследаваннях рознага ўзроўню. У лексіка-семантычным, структурным і генетычным аспектах ён даследаваў мовазнаўчыя, літаратуразнаўчыя, матэматычныя, астранамічныя, прыродазнаўчыя тэрміны ў беларускіх выданнях пачатку ХХ ст., вызначыў прынцыпы стварэння, шляхі і спосабы папаўнення, развіцця і ўпарадкавання нацыянальнай тэрміналогіі ў 1920–90-я гг. Невыпадкова трое з чатырох падрыхтаваных В. П. Краснеем кандыдатаў навук прысвяцілі свае дысертацыйныя працы асобным тэрмінасістэмам – прыродазнаўчай і прамысловай (Т. В. Капяйко), батанічнай (А. М. Лапкоўская), філасофскай (Ю. М. Лук'янюк). Найбольш значныя і аўтарытэтныя працы Віктара Пятровіча ў 2011 г. былі апублікаваны калегамі па кафедры ў асобным зборніку «Беларуская тэрміналогія», прымеркаваным да 75-годдзя навукоўца. Большасці прац лінгвіста былі ўласцівыя рамантычна-ўзнёслы стыль аповеду, публіцыстычнае напаўненне думкі народна-выразным словам, ёмкімі фразеалагізмамі, адпаведнымі прыказкамі і прымаўкамі, цытатамі з разнастайных вершаў, сотні якіх ён ведаў на памяць.

Шчырым словам успамінаюць свайго настаўніка дзясяткі дыпломнікаў, сотні выпускнікоў філалагічнага факультэта, удзячныя Віктару Пятровічу за такт і вытрымку, уменне знайсці спагадлівае слова, падтрымаць і аказаць дапамогу ў навуковым пошуку. Удзячныя яму і шматлікія пераможцы і прызёры рэспубліканскіх алімпіяд па беларускай мове, удзельнікам і шматгадовым старшынёй журы якіх быў В. П. Красней.

Больш за 50 гадоў аддаў Віктар Пятровіч службе роднаму слову. І сёння як запавет успры-

маюцца яго словы: «Кожны народ праз сваю родную мову стварае сваю “мадэль” свету. Таму мы, беларусы, каб не страціць генетычнай памяці і ўсвядоміць сваё этнічнае “Я” ў агульнасусветнай супольнасці людзей, павінны шанаваць і гаварыць сваёй мовай, каб яна жыла і спявала ў вуснах цяперашняга і будучых пакаленняў. Яшчэ не ўсё страчана».

Перапыніўся жыццёвы шлях сапраўднага патрыёта-беларуса, шчырага і бескарыслівага дарадцы-навукоўца, удумлівага і разважлівага метадыста-практыка, моваведа-рамантыка, адмысловага стыліста. Але працы і думкі яго, мары і спадзяванні будуць і надалей натхняць усіх тых, хто яго ведаў і працаваў з ім поруч, хто яшчэ не адзін раз звернецца да павучальнага слова прафесара Віктара Краснея.

***М. Р. Прыгодзіч***,
доктар філалагічных навук, прафесар,
загадчык кафедры гісторыі беларускай мовы БДУ